Настаўніцкая газета
№ 4 (8766), 13 студзеня 2023 года

# Даць дабро

Мабільная акадэмія, бясплатная юрыдычная кансультацыя, атрад па захаванні бяспекі на вадзе... Якія яшчэ праекты рэалізуюць валанцёрскія цэнтры ўстаноў вышэйшай адукацыі, чыя работа адзначана па выніках 2022 года Падзякай міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Алена Галавань, намеснік начальніка Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра:**

— Актыўная валанцёрская работа вядзецца сёння ва ўстановах адукацыі розных узроўняў, ад школ да ўніверсітэтаў. Рэалізуецца шмат цікавых, карысных праектаў. Іх вопыт мы абагульняем, распаўсюджваем. Лепшыя не застаюцца без заахвочвання. На II Рэспубліканскім фестывалі метадычных распрацовак па арганізацыі тэматычных заняткаў па валанцёрстве, які адбыўся ў снежні мінулага года, 17 валанцёрскіх цэнтраў узнагароджаны Падзякай міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь. Прадстаўленыя на фестывалі лепшыя распрацоўкі ўстаноў адукацыі апублікаваны ў зборніку "Як навучыць дапамагаць", гэта ўжо другое такое выданне.

## Сардэчная эканоміка

У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце плённа працуе цэнтр валанцёрскай дзейнасці.

Будучыя эканамісты асабліва вызначаюцца сваёй актыўнай сацыяльнай работай. Шмат дапамагаюць адзінокім пажылым людзям і інвалідам Заводскага раёна Мінска, на тэрыторыі якога размешчаны ўніверсітэт. Студэнты факультэта эканомікі і менеджменту шэфствуюць над домам-інтэрнатам для пенсіянераў і інвалідаў "Дамашні ачаг", дзіцячымі дамамі-інтэрнатамі і карэкцыйна-развіццёвымі цэнтрамі Мінска, Барысава, Навагрудка. Вядуць заняткі для пажылых людзей у Мінскім універсітэце трэцяга ўзросту. Дапамагаюць прытулкам для бяздомных жывёл.

> *Моладзь адкрыта для новага, гатова дапамагаць. Мы гэты рэсурс імкнёмся выкарыстоўваць і накіроўваць у канструктыўнае рэчышча.*
>
> **Дзяніс ВАСЬКОЎ.**

На факультэце права створана студэнцкая юрыдычная клініка. Старшакурснікі бясплатна кансультуюць сацыяльна ўразлівыя катэгорыі грамадзян. Людзі звяртаюцца сюды ў вызначаныя часы прыёму, студэнты іх праблему выслухоўваюць і з дапамогай выкладчыкаў факультэта даюць пісьмовы адказ.

Плённа працуе цэнтр валанцёрскай дзейнасці БДЭУ ў кірунку гісторыка-патрыятычнага выхавання. Адзін з атрадаў займаецца ўшанаваннем памяці аб нашых земляках, якія маюць званне Героя Савецкага




Кожны год ва ўніверсітэце праводзіцца конкурс на лепшы валанцёрскі праект. У 2021 годзе яго пераможцай стала студэнтка ўлікова-эканамічнага факультэта Настасся Жураўлевіч з этнаграфічным праектам аб яе родным Клімавіцкім раёне. Сабраны ёю багаты матэрыял надрукаваны асобнай кнігай. У 2022 годзе лепшым быў прызнаны праект студэнтак факультэта маркетынгу і лагістыкі, якія распрацавалі мабільны дадатак у дапамогу хворым на дыябет людзям. Збіраюцца падаць работу на атрыманне гранта.

> Старшакурснікі факультэта права стварылі студэнцкую юрыдычную клініку, дзе кансультуюць бясплатна.

"Эдвайзеры" ладзяць інфармацыйна-кансультацыйныя акцыі ў сценах роднага ўніверсітэта, іншых навучальных устаноў, а таксама ў гандлёвых цэнтрах Мінска.

Па праве ганарацца ва ўніверсітэце і сваёй студэнцкай газетай "БДАТУ сёння". Яна выдаецца раз у месяц самімі студэнтамі. Друкуюцца навіны навучальнай установы, шмат расказваецца аб валанцёрскай дзейнасці.

Выдатна зарэкамендавалі сябе студэнты-аграрыі і ў сацыяльным валанцёрстве. Калі восенню ў сталіцы праходзяць сельскагаспадарчыя кірмашы, бабулі і дзядулі не нарадуюцца бясплатнай дапамозе дужых хлопцаў па дастаўцы набытай агародніны. Даўняе сяброўства звязвае УВА з Бягомльскай школай-інтэрнатам. Дапама-





цёрскай дзейнасці.



— Моладзь адкрыта для новага, гатова дапамагаць. Мы гэты рэсурс імкнёмся выкарыстоўваць і накіроўваць у канструктыўнае рэчышча. Ужо на першым сходзе перад першакурснікамі выступаюць нашы вопытныя валанцёры, расказваюць аб дабрачыннай дзейнасці, дзеляцца сваімі матывуючымі гісторыямі. Праводзім анкетаванне, якое дапамагае вызначыць зацікаўленасць хлопцаў і дзяўчат у такой рабоце. Усім жадаючым спачатку даём разавае даручэнне, глядзім, як паказваюць сябе. Потым падключаем да праектаў. На кожным факультэце, а іх у нас 10, створаны свой валанцёрскі атрад, — расказвае начальнік упраўлення выхаваўчай работы БДЭУ Дзяніс Васькоў.

ляках, якія маюць званне Героя Савецкага Саюза: збіраюць і папулярызуюць інфармацыю аб іх, даглядаюць месцы пахавання. У Год гістарычнай памяці студэнты універсітэта далучыліся да шэрага рэспубліканскіх праектаў і акцый. Так, падчас Усебеларускай маладзёжнай экспедыцыі "Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства" займаліся вывучэннем дзейнасці партызанскіх атрадаў, складалі карты іх маршрутаў.

Студэнты факультэта камерцыі і турыстычнай індустрыі стварылі атрад "Валанцёры Асвода". Дапамагаюць ратавальнікам у рабоце па папярэджанні няшчасных выпадкаў на вадзе. Праводзяць прафілактычныя акцыі, выступаюць з лекцыямі перад дзецьмі ў школах. У найбольш небяспечныя перыяды года патрулююць мінскія вадасховішчы.

**права стварылі студэнцкую юрыдычную клініку, дзе кансультуюць бясплатна.**

— Вельмі важна не толькі сабраць валанцёрскую групу і навучыць яе працаваць, але і падтрымліваць баявы дух. Як вядома, маладыя людзі з радасцю ўключаюцца ў новыя справы, але гэтак жа хутка могуць і страціць цікавасць. Таму імкнёмся даваць ім магчымасці для развіцця, праводзім трэнінгі, заахвочваем лепшых удзелам у яркіх рэспубліканскіх культурных, забаўляльных, вучэбных мерапрыемствах. Нашы студэнты паспяхова выступаюць у такіх праектах, як "Валанцёрскі навігатар", "Мінская змена" і іншых, — адзначае каардынатар цэнтра валанцёрскай дзейнасці БДЭУ Павел Саўрыцкі.

## Сеяць годнае

У Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце паспяхова дзейнічае валанцёрскі цэнтр "САВА" (Студэнцкае аб'яднанне валанцёраў-аграрыяў).

— Большасць нашых студэнтаў — гэта сельская моладзь. Я не перастаю здзіўляцца, якая яна шчырая і спагадлівая. Для іх зрабіць добрую справу — нешта такое, што разумеецца само сабой. І гэта пры тым, што вучацца тут у асноўным хлопцы. Калі да нас прыходзяць першакурснікі, мы імкнёмся з першых тыдняў данесці да іх інфармацыю аб кірунках нашага валанцёрства. Робім гэта не толькі на факультэцкіх сходах. Да Дня народнага адзінства 17 верасня правялі агульнаўніверсітэцкую прэзентацыю "Валанцёры — гэта мы!", падчас якой да нашай каманды далучыліся новыя хлопцы і дзяўчаты, — расказвае каардынатар валанцёрскага цэнтра БДАТУ "САВА" Ала Віткоўская.

Адзін з асноўных кірункаў дзейнасці цэнтра — экалагічны. Валанцёры актыўна ўдзельнічаюць у прыродаахоўных мерапрыемствах, рэалізуюць шэраг актуальных праектаў, такіх як "Старыя лекі", "Зялёны рух", "Экалогіка". Пры гэтым студэнты не толькі самі атрымліваюць веды па пытаннях дружалюбнага да экалогіі ладу жыцця, адказнага спажывання, але і папулярызуюць іх сярод іншых. Валанцёры атрада

лі не нарадуюцца бясплатнай дапамозе дужых хлопцаў па дастаўцы набытай агародніны. Даўняе сяброўства звязвае УВА з Бягомльскай школай-інтэрнатам. Дапамагаюць студэнты сталічнаму дзіцячаму дому-інтэрнату для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Ужо не першы год разам з агракамбінатам "Ждановічы" ладзяць дабрачынныя акцыі: адвозяць у падарунак дзецям частку яблыкаў, якія назбіралі ў гаспадарцы восенню.

Мінулы год адзначыўся новым сацыяльным праектам "Мабільная акадэмія". Будучыя аграрыі дапамагалі асвоіць функцыі гаджэтаў жыхарам спецыяльнага дома для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў № 1 Мінска, а таксама пажылым наведвальнікам тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна сталіцы. Ала Іванаўна з усмешкай расказвае, што бабулі былі крыху здзіўлены, што ў якасці валанцёраў у цэнтр прыйшлі не дзяўчаты, а здаровыя хлопцы з аграмеханічнага факультэта, як кажуць, цэлы сажань у плячах. Але ўсе добра паладзілі і з карысцю правялі час.

**По праве ганарацца ва ўніверсітэце сваёй студэнцкай газетай "БДАТУ сёння".**

— Аграмеханічны факультэт у нас самы мужчынскі, але пры гэтым ён адзін з найбольш актыўных у плане валанцёрства. У першых радах заўсёды і факультэт прадпрымальніцтва і кіравання, што не дзіўна, бо ён якраз самы жаночы. А ўвогуле, у дабрачынных справах удзельнічаюць усе факультэты, ніхто не застаецца абыякавым, — адзначае прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце БДАТУ Уладзімір Сінельнікаў. — Упэўнены, што новы, 2023 год, які аб'яўлены ў нашай краіне Годам міру і стварэння, будзе напоўнены ў тым ліку актыўнай валанцёрскай работай нашых студэнтаў. Ужо ў адзін з першых яго дзён, 5 студзеня, яны прынялі ўдзел у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі "Ад усёй душы", наведаўшы дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў "Выток".

**Аксана МЫЦЬКО.**